■ Паміж чорным і белым

Сяргей БЯЗРУКАЎ:

«ШЧАСЦЕ Ў ТЫМ, ШТО ТЫ РОБІШ»

Пры падтрымцы мінскага прыватнага «Тэатра Ч» напярэдадні свайго 40-годдзя народны артыст Расіі Сяргей Бязрукаў наведаў Мінск са спектаклем «Хуліган. Споведзь», які быў прымеркаваны да 118-годдзя з дня нараджэння Сяргея Ясеніна. У пастаноўцы вядомы артыст выступіў адразу ў двух амплуа — як рэжысёр-пастаноўшчык і выканаўца галоўнай ролі. Падчас сустрэчы з журналістамі акцёр падзяліўся сваімі разважаннямі пра мастацтва, беларускі сэрвіс і творчыя перспектывы.

Тэатр без абмежаванняў

«Я назваў спектакль «Хуліган. Споведзь» паэтычным шоу, бо галоўнае ў ім — паэзія і нічога, акрамя яе. Упершыню з такім спектаклем мы выступалі на крамлёўскай сцэне, мне вядома, як гэта — працаваць на вялікую аўдыторыю. Для мяне шчасце, што людзі прыходзяць паслухаць паэзію. Калі паглядзець водгукі на пастаноўку, то становіцца зразумела: прыходзяць тыя, хто чакае майго прыезду, хоча пачуць вершы Ясеніна. Тэатр — гэта магія, і нельга патлумачыць, як яна ствараецца».

«Я заўсёды выступаў за тэатр, даступны для ўсіх. У тым разуменні, што не проста для народа, а менавіта для ўсіх слаёў насельніцтва. У тым ліку і для людзей з асаблівымі патрэбамі. Нядаўна ў Маскоўскім губернскім тэатры, які я ўзначальваю, мы паказалі спектакль з тыфлакаментаваннем (з каментарыямі для невідушчых). У Расіі гэта было зроблена ўпершыню. Пакуль што мы паказваем толькі адзін спектакль — «Пушкін», але працуем над тым, каб яшчэ з'явіліся такія пастаноўкі. Бо нельга проста так узяць і каментаваць спектакль, трэба спецыяльнае абсталяванне, спецыяльна адукаваныя людзі. Мы зрушылі справу з мёртвага пункта: іншыя тэатры таксама пачалі над ёй працаваць. Невідушчыя, як і ўсе мы, хочуць мець магчымасць прыйсці на спектакль на роўных. Падараваць білет сваёй другой палавіне. Яны не хочуць быць у ізаляцыі».

Пра кінагерояў і маркетынг

«Акцёраў запрашаюць у той ці іншы праект, каб зрабіць потым добрую рэкламу фільму ў пэўным рэгіёне. Калі казаць пра сур'ёзныя галівудскія карціны з удзелам нашых «зорак», то дай Бог, каб такія прапановы паступалі. Але варта не забываць, што за мяжой наш артыст не будзе запатрабаваны на тым жа ўзроўні, як і ў Расіі».

«Практычна ўсе маі калегі ўжо сыгралі многіх славутых людзей. Я ў гэтым, можна сказаць, адстаў ад спіска. Але, што тычыцца асобы ў гісторыі, то я іграў любімых паэтаў. Думаю, такая цікавасць да персанажаў мінулага звязана з нястачай асоб у гісторыі сёння. Дакладней, асобы ёсць, аднак адсутнічае «прарок у айчыне». У нас любяць не пры жыцці, а пасля смерці. Сёння веры практычна не засталося. Але мы верым тым, хто некалі стварыў нашу гісторыю. Усе мы глядзелі фільм пра Валерыя Харламава. Гісторыя патрыятычная ў тым сэнсе, што раптам на тэме хакея мы аб'ядналіся, пачалі аднолькава думаць і перажываць адно і тое ж».

«Мне падабаецца здымацца ў Беларусі. Успамінаю многія карціны, якія здымалі на «Беларусьфільме». Напрыклад, «У чэрвені 41-га», дзе я сыграў аднаго з герояў вайны — Івана Бурага. Калі будуць прапановы яшчэ ў вас здымацца, то, безумоўна, з задавальненнем пагаджуся».

Імя, лёс і прабелы ў гісторыі

«У маёй сям'і захапляліся паэзіяй Сяргея Ясеніна. І назвалі мяне ў гонар вялікага паэта. Таму я марыў сыграць яго і ішоў да гэтай ролі. Пасля фільма ўзнік спектакль «Хуліган. Споведзь», які запатрабаваны ўсімі і ўсюды. Спачатку мы збіралі невялікія залы пад тысячу, а цяпер — амаль стадыёны. Попыт на паэзію расце, асабліва апошнім часам. Магчыма, гісторыя паўтараецца».

«Мы, мастакі, можам толькі выказваць сваю пазіцыю. Што тычыцца версіі смерці паэта, то я выказаў сваю і адмаўляцца ад яе не збіраюся. Я лічу, што яго забілі. Людзі, якія прафесійна даследавалі гэтую справу, ужо пакінулі нас. Мы не крыміналісты, каб расследаваць, але мне хацелася б сказаць праўду».

Свята на працы і ролі на заўтра

«Свой юбілей ніяк не буду адзначаць. Як і на ўсе свае дні нараджэння, я буду працаваць. Лічу, што свята павінна прысутнічаць у жыцці кожны дзень. Трэба знаходзіць шчасце ў тым, што ты робіш».

«У кожным героі, якога я іграў, было станоўчае і адмоўнае. Пытанне было ў тым, што пераможа. Я заўсёды выбіраю па інтарэсах. Калі роля мне падабаецца, то я зраблю паўзу ў графіку, каб паздымацца ў нейкім праекце. Сёння ў мяне ёсць тэатр, і ён — асноўнае маё захапленне. Рыхтуем з Дзімам Дзюжавым новы спектакль па Астроўскаму «Найшла каса на камень». Працую над рэпертуарам. Мне важна стварыць каманду, з якой змогуць працаваць рэжысёры. Складана нешта прагназаваць, трэба проста працягваць працу. Прапаноў хапае».

Алена ДРАПКО

Даты | Падзеі | Людзі

Дзень шэфа (прафесійнае свята бізнесменаў). Святкуецца ў знак прызнання кіраўнікоў ведамстваў, кампаній і фірмаў і асаблівай да іх павагі.

1618 год — 395 гадоў назад адбылося выступленне гараджан Магілёва супраць прымусовага ўвядзення царкоўнай уніі, якое ўвайшло ў гісторыю пад назвай Магілёўскае паўстанне. Штуршком да яго сталі дзеянні полацкага ўніяцкага архіепіскапа Ясафата Кунцэвіча, які ў кастрычніку 1618 года накіраваўся ў Магілёў з намерам закрыць там праваслаўныя царквы і навязаць жыхарам унію. Магістрат Магілёва заявіў, што горад не будзе падпарадкоўвацца ўніяцкай мітраполіі. Даведаўшыся пра набліжэнне Кунцэвіча, гараджане зачынілі перад ім браму, устанавілі на гарадскім вале гарматы, пагражаючы выкарыстаць зброю, калі архіепіскап паспрабуе пранікнуць у Магілёў. Тады Кунцэвіч паехаў у Варшаву, каб паведаміць аб гэтым здарэнні каралю Жыгімонту III, і дамогся выдання каралеўскага ўніверсала, згодна з якім 20 удзельнікаў выступлення былі асуджаны да смяротнага пакарання, а на жыхароў горада накладзены штраф.

1813 год — Бітва народаў. Такую назву ў сусветнай гісторыі атрымала бітва, якая пачалося ў гэты дзень ў 1813-м годзе каля нямецкага горада Лейпцыг. Саюзная армія ў складзе Расіі, Аўстрыі, Прусіі і Швецыі супрацьстаяла войскам Напалеона Банапарта. На баку французаў ваявалі палякі, італьянцы, бельгійцы, галандцы і іншыя народы. Па колькасці воінаў і ўзбраення перавага была на баку саюзнікаў. Баявыя дзеянні працягваліся чатыры дні. Толькі ў першы дзень страты склалі каля 30 тысяч байцоў з кожнага боку. Пазбегнуўшы поўнага разгрому, Напалеон адступіў. Былі вызвалены ад французаў Германія і Галандыя. Лейпцыгская бітва істотна паскорыла падзенне імперыі Напалеона ў наступным, 1814 годзе.

1941 год — нарадзілася Надзея Віктараўна Півень, беларускі вучоны ў галіне імуналогіі, доктар медыцынскіх навук (1993). Аўтар навуковых прац па механізмах імунарэгуляцыі арганізма, распрацоўцы новых сродкаў імунахімічнага аналізу біярэгулятараў і метадалогіі іх выкарыстання ў практычнай медыцыне. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).

Было сказана

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, класік беларускай літаратуры і драматургіі:

«Ды гэта ўжо, відаць, прысуджана спрадвеку, што дух пярэчання жыве ў чалавеку».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Прыклон. Памада. Энас. Гмах. Лат. База. Накат. Духі. Шума. Печ. Рапорт. Манеўра. Аск. Лта. Нагі. Камар. Мараду. Ампатра. Рак. Камера. Кокс. Кіна. Хагат. Крот. Разлік. Каса. Бак. Параход. **Па вертыкалі:** Дума. Вкар. Шхуна. Арак. Маці. Праграб. Пудра. Анекс. Рука. Крэм. Чака. Каяка. Пага. Гумар. Лак. Лпа. Хв. Офіс. Тул. Арат. Кап. Ліна. Нарэзан. Асака. Кагарлі. Тон. Аборка. Паркет. Газ. Астарожа.

■ На свежым паветры

АДПАЧЫЦЬ... ПА-ЕЎРАПЕЙСКУ?!

Чым здзівіў і расчараваў open-air «Цэнтр Еўропы» ў Ратамцы?

Самая вялікая клёцка ў Еўропе, якую абяцалі прэзентаваць на вышэйзгаданым фэсце, аказалася памерам усяго толькі... з качан капусты. А прысутныя ж чакалі гіганцкую...

Тым не менш кулінарная частка опэн-эйру абяцала быць цікавай. У праграме значылася сямейна-кулінарнае шоу, а ў дадатак — майстар-класы па прыгатаванні страў з розных еўрапейскіх кухань ад лепшых шэф-кухараў мінскіх рэстаранаў. Дарэчы, у іх атрымалася пазнаёміць людзей з адной цікавай, смачнай і простай стравай беларускай кухні, але пра ўсё па парадку...

«Пы́зы — гэта смачна»!

...Сем'яў, якія павінны былі спаборнічаць у прыгатаванні страў з бульбы, чамусьці аказалася толькі тры. Дакладней, дзве: сям'я Федаровічаў, сям'я Якубоўскіх і «адна за ўсіх» абаяльная жанчына Дар'я Кудзіна. Проста на свежым паветры, карыстаючыся электрычнымі пліткамі, сем'і гатавалі свае «фірмовыя» стравы з бульбы. Напрыклад, сям'я Федаровічаў падзялілася цікавым рэцэптам дранікаў з рыбай.

Калі публіка ўжо досыць нанюхалася апетытных водараў, за справу ўзяліся шэф-кухары (фота 1), якія, па праўдзе сказаць, зрабілі немагчымае. На маленькіх сталах, што стаялі проста на траве, яны па чарзе гатавалі беларускія, нямецкія, чэшскія і англійскія стравы з бульбы. Дарэчы, пытанне: чаму нельга было пабудаваць для кулінарных майстар-класаў хоць малюсенькую сцэну, каб кухараў, што шчыруюць над гарачай патэльняй, не заціскалі ў кола галодныя гледачы? У тлуме опэн-эйру яно засталося без адказу, бо нашмат цікавей было назіраць за працэсам прыгатавання. Так, шэф-кухар сеткі рэстаранаў «Еўразія» Павел Глечыкаў навучыў усіх прысутных гатаваць пызы. Гэта традыцыйная беларуская страва, нешта сярэдняе паміж дранікамі і сырнікамі. Калі жадаеце паспытаць, што ж гэта такое, вазьміце колькі бульбін, надзярыце на дробнай тарцы, дадайце тварог і невялікую колькасць мукі і крухмалу, пасаліце і папярчыце. З гатовага цеста раскатайце невялічкія аладкі, у якія загарніце смажаны фарш з прыправамі. Смажацца пызы на патэльні, як і дранікі.

Вядучая майстар-класа аднекуль даведалася, што сярод прысутных «прытаіўся» англічанін, якому далі пакаштаваць нашу нацыянальную страву.

— Пызы? Смачна! — вымавіў ён падказанае перакладчыкам слова.

Кухары прадоўжылі шчыраваць, так што публіка пакаштавала яшчэ нямецкі бульбяны салат, чэшскія брамбаракі (бульбяныя аладкі), а таксама англійскую страву з бульбы і печані пад назвай «Гусь бедняка».

Акурат напрыканцы майстар-класаў прысутных паклікалі на прэзентацыю «самай вялікай у Еўропе клёцкі». Вось яно, тое самае «расчараванне». Вынеслі на талерцы жоўты калабок памерам з качан капусты (фота 2), ды яшчэ і ўдакладнілі: калі нехта думаў, што яна будзе большая, ён памыляўся. І прапанавалі крыху пачакаць, каб «пакаштаваць фрагменты» клёцкі-рэкардсменкі.

«Мы яшчэ будзем «на кані»

— Мы пастараліся зрабіць усё, каб гэтае свята было запамінальным. Ёсць планы, каб налета выступалі для публікі не толькі беларускія калектывы, але і замежныя. Мы будзем расці і ўдасканальвацца, — паабяцаў адзін з арганізатараў, дырэктар Цэнтра стратэгічнага развіцця «Маркетынгавыя сістэмы» Анатоль Аканцінаў.

А жанчыны ў натоўпе ў гэты час па-змоўніцку перашэптваліся: «А калі там коннае шоу?»

Конна-спартыўнае шоу пад назвай «Кавалькада», сказаць па праўдзе, не расчаравала. Малыя дзеці, ды і дарослыя людзі са шчырым захапленнем назіралі за выездкай, вальтыжыроўкай (акрабатычныя практыкаванні на спіне ў каня, які бяжыць па кругу). Пляскалі ў далоні, калі на манеж у элегантных касцюмах і капелюшах выехалі прадстаўніцы вышэйшай школы верхавой язды Галіна Зотава і Надзея Фёдарава, чые коні паслухмяна хадзілі так, як хацелі вершніцы, але іх «кіраўніцтва» было зусім незаўважнае.

Там, дзе шмат дзяцей, ніколі не бывае ціха. Вось і на мерапрыемстве ў Ратамцы хлопчыкі і дзяўчаткі насіліся за пераапранутымі аніматарамі, вішчалі, накідвалі кольцы на палкі, каталіся на «прыкатных» роліках і займаліся яшчэ шэрагам спраў, незразумелых сярэднестатыстычнаму дарасламу.

Якая забаўка была «хітом»? Аніматар, малады хлопец выдаваў купцы яснавокай малечы спецыяльную «зброю» — мяккія мячы. А пасля станавіўся «ахвярай». Дзеці без шкадавання малацілі па ім мячамі, паступова заганяючы за бліжэйшыя дрэвы...

Прысутныя заўважна ажывіліся, калі на стадыёне пачалі надзімаць сапраўдны вялікі паветраны шар. Многія кінуліся паглядзець на такое дзіва і пакатацца, зразумела, але шар падняўся ў паветра толькі пару разоў.

...«Еўрапейскае» свята падвялі да завяршэння малыя насы, ручкі і ножкі, якія за некалькі гадзін знаходжання на вуліцы крыху падмерзлі і запатрабавалі неадкладнага вяртання дахаты. «Мама, я хачу есці!» — прасіла бялявая дзяўчынка ў зялёненькай куртцы. Мама спрачацца з ёй не стала, а таму хуценька падхапіла малую на рукі і рушыла да выхаду...

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота аўтара

■ Выстава

Маці, Мадонны, гераіні

Знакамітыя і простыя, але прыгожыя, спагадлівыя, клапатлівыя. Зачаравацца, натхніцца, схіліць галаву — вось тыя эмоцыі, на якія разлічана выстава «Прысвячаем маці», якую прапануе Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.

Жанчына як вышэйшая істота, якая дае жыццё і сваёй любоўю ахоўвае яго, — гэта тэма творчасці беларускага мастака Аляксея Кузьміча. Аўтар больш за 600 твораў, у якіх апеты вобраз жанчыны, акцэнтуе ўвагу на тым, што яны — Мадонны, вартыя пакланення ў любыя часы: што на зары чалавецтва, што ў эпоху Рэнесансу, што ў наша імклівае і, здаецца, вельмі рацыянальнае XXI стагоддзе. Чалавецтва праходзіць свой доўгі час менавіта дзякуючы таму, што ёсць Маці, якія пакідаюць пасля сябе працяг.

У пацвярджэнне гэтай думкі мастацкія творы, дапоўненыя рэальнымі сведчаннямі пра зямны шлях асоб з беларускай гісторыі, сярод якіх былі жанчыны — Героі Сацыялістычнай працы, дэлегаты з'ездаў Саветаў, заслужаныя работнікі адукацыі, спартсменкі, актрысы. Іх імёны былі на слыху — дастаткова ўзгадаць Стэфанію Станюту ці Вольгу Корбут. Але была яшчэ часткай таго жыцця, дзе яны былі звычайнымі жанчынамі, выхоўвалі дзяцей. Пра што пісалі сваім сынам паэтка Еўдакія Лось і актрыса Аляксандра Клімава? Можна даведацца з дакументаў, якія прадставіў для выставы Беларусі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Выстава дэманструе ўзнёсласць мастацкага ўвасаблення найвялікшай місіі жанчыны, у спалучэнні з ілюстрацыяй таго, як праяўлялася любоў у штодзённым жыцці.

Ларыса ЦІМОШЫК

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	7.39	18.10	10.31
Віцебск	7.31	17.58	10.27
Магілёў	7.30	18.00	10.30
Гомель	7.24	17.59	10.35
Гродна	7.54	18.25	10.31
Брэст	7.52	18.29	10.37

Месяц

Поўня 19 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Васілісы, Дзяніса, Івана.*
К. *Маргарыты, Фларанціны, Ядвігі, Герарда.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Парады жанчынам.

Вы хочаце вызначыць, ці надышоў вам час худзець? Гэта проста! Калі мужчына можа аднесці вас на руках у ложак — вы ў добрай форме. Калі не — памяняйце яго на нармальнага мужыка!

Гаварыла ж мне ў дзяцінстве мама: «Міша, цягні ноты! Не лянуйся!..»
Я яе не паслухаў. Цяпер цягаю піяніна...

Я вось не разумею розніцы паміж конкурсамі «Міс Сусвет» і «Міс Свету».

У «Міс Сусвету» яшчэ і іншапланецяне ўдзельнічаюць?

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.185. Індэкс 63850. Зак. № 4527.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 кастрычніка 2013 года.